2. Raymond, M. Diagnosing and managing acute abdominal pain in children / M. Raymond, P. Marsicovetere, K. De Shaney // JAAPA. – 2022. – Vol. 35 (1). – P. 16–20.

# САНІТАРНА–МЕДЫЦЫНСКІЯ АСПЕКТЫ АБМЕНА ПАЛОННЫМІ Ў 1921 Г. У ПАВЕДАМЛЕННЯХ ПАЎЛА КЛІНГЕРА

***Ціхаміраў А.У.***
*Гродзенскі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі*

Рэпазіторый ГрДМУ

**Актуальнасць.** Гісторыя медыцыны Беларусі ў 1920–1930–я гг. з’яўляецца важнай навуковай праблемай. якая мае таксама значны патэнцыял у выхаваўчым працэсе.

**Мэта.** Даследванне санітарна–медыцынскага аспекта абмена ваеннапалоннымі паміж Савецкай Расіяй і Польшчай ў 1921 г. на прыкладзе пункта абмена палоннымі ў Баранавічах у паведамленнях урача Паўла Клінгера.

**Метады даследвання.** Пры даследванні дадзенай тэмы былі выкарыстаны агульнанавуковыя, гісторыка–генетычны і параўнальна–гістарычны метады.

**Результаты и их обсуждение.** З сакавіка 1921 г. адбываўся працэс абмена ваеннапалоннымі паміж Савецкай Расіяй і Польшчай у рамках заключаных пагадненняў. Адзін з пунктаў абмену быў арганізаваны ў Баранавічах. Сведкам работы гэтага пункта быў урач Павел (Пінхас) Клінгер (1894–1943), спецыяліст у галіне ўралогіі, венералогіі і сексалогіі. З верасня 1939 г. ён жыў у Гродне, а з 1941 г. быў вязнем гродзенскага гета [1, с. 81].

У сакавіку і красавіку 1921 г. П. Клінгер знаходзіўся ў Баранавічах. 18 красавіка 1921 г. выйшаў яго артыкул з падрабязным апісаннем санітарна–медыцынскіх аспектаў працэса абмена ў адносінах да савецкіх і польскіх ваеннапалонных. Між іншым ён пісаў: “Кожны надыходзячы транспарт з палоннымі, якія вяртаюцца з няволі ўрачыста вітаецца на чыгуначным вакзале ген. Білевічам, афіцэрскім корпусам і вайсковым аркестрам. Пасля кароткага вітання з боку генерала, які віншуе іх шчырымі словамі са шчаслівым вяртаннем у краіну, прыбыўшыя пад музыку перадаюцца ў спецыяльна створанае сартавальнае бюро, у якім ўрач іх падзяляе на здаровых і хворых. Хворыя накіроўваюцца адразу ў бальніцу, а здаровыя партыямі па 100 чалавек – у лазню, якая знаходзіцца побач з сартавальным бюро. У лазні палонных мыюць, стрыгуць і пазбаўляюць ад вошаў. Іх абмундзіраванне, калі яшчэ яно ёсць, перадаецца для дэзінфекцыі, у супрацьлеглым выпадку – яны атрымліваюць зусім новае ад інтэндантуры пункта абмена палоннымі. Дадаткова атрымліваюць чыстую бялізну. Пасля купання скіроўваюцца ў спецыяльна створаныя для прыбыўшых баракі, якія ўтрымліваюцца ва ўзорнай чысціні, маюць электрычнае асвятленне і добра вентылююцца. Тут кожны з іх

атрымлівае коўдру, сеннік, посуд для ежы і значнае, але здаровае харчаванне ад бездаганна дзеючай інтэндантуры пункта абмена палоннымі пад кіраўніцтвам выдатнага прафесіянала, капітана Войсэ. На наступны дзень урач прымаючай станцыі пачынае рабіць прафілактычныя прышчэпкі ад халеры і сыпнога тыфу, якія паўтараюцца два разы. Пасля сямі дзён урачыста ў прысутнасці ген. Білевіча і афіцэрскага корпуса транспарт адпраўляецца далей. Што тычыцца бальшавікоў, інтэрніраваных у Польшчы і якія вяртаюцца ў Расію, то трэба адзначыць, што яны знаходзяцца ў выгодных памяшканнях баракаў станцыі і атрымліваюць добрае харчаванне. Санітарныя працэдуры ў адносінах да іх такія самыя, як і ў адносінах да нашых салдатаў” [2, s. 5].

**Выводы.** Паведамленні П. Клінгера дапаўняюць агульную карціну арганізацыі абмена палоннымі з боку Польшчы ў 1921 г.

### ЛИТЕРАТУРА

1. Ціхаміраў, А. У. Павел Клінгер: лёс навукоўца з гродзенскага гета / А. У. Ціхаміраў // Государства Центральной и Восточной Европы в исторической перспективе: сборник научных статей / редкол.: В. Дунай [и др.]; под ред. В.И. Дуная. – Пинск: ПолесГУ, 2023. – Вып. 8. – С. 81–83.

2. Klinger, P. Wymiana jeńców w Baranowiczach (Organizacja punktu wymiany) / P. Klinger // Rzeczpospolita. – 1921. – 18 kwietnia. – S. 5.

## АНАЛИЗ ПСИХОМЕТРИЧЕСКИХ ПАРАМЕТРОВ ШКАЛЫ ИМПУЛЬСИВНОСТИ ОПРОСНИКА НЕВРОТИЧЕСКИХ РАССТРОЙСТВ

***Цидик Л.И.***

*Гродненский государственный медицинский университет*

**Актуальность.** Классическая теория тестов, которая явилась основой для создания большинства диагностических инструментов, используемых в клинике сегодня, в том числе и опросника невротических расстройств, имеет множество недостатков, связанных с отсутствием в ней измерительных принципов. На сегодняшний день актуальны передовые психометрические технологии, созданные на основе современной теории тестов. К ним относится метрическая система Раша.

**Цель.** Произвести психометрический анализ шкалы импульсивности опросника невротических расстройств на основе модели Раша.

**Методы исследования.** Исследование осуществлялось на базе психоневрологического отделения учреждения здравоохранения «Городская клиническая больница №3 г. Гродно». Группа исследования включала 296 человек.

Репозиторий ГрГМУ